# ДОБРЫ ЧАЛАВЕК І ЖЫВЁЛУ ШКАДУЕ



**Мы працягнем знаёмства** з творамі пра ста́ўленне да птушак і звяроў, пра добрыя і дрэнныя ўчынкі людзей у адносінах да прыроды.

**Мы будзем вучыцца:**

- ✓ знаходзіць у творы партрэт дзейнай асобы;
- ✓ вызначаць рысы характару персанажаў;
- ✓ тлумачыць учынкі герояў, разумець адносіны аўтара да іх;
- ✓ выказваць свае адносіны да твора, персанажаў, іх учынкаў;
- ✓ называць у вывучаных творах галоўнага героя, вызначаць здзейснены ім учынак і яго прычыну.

**Варта задумацца.** Чаму трэба беражліва і з клопатам адносіцца да жывёл і ўвогуле да прыроды?



Правообладатель Национальный институт образования



**НІНА ГАЛІНОЎСКАЯ**

## Сябры прыроды

Нас кліча дрэва кожнае,
Травінка і ручэй.
Вядзе сцяжынка росная.
Не адставай, хутчэй.

Усюды мы жаданыя —
У полі і ў бары.
Прыроды мы адданыя,
Надзейныя сябры.

Нас птушкі, насякомыя,
Жывёлы і звяры,
Дагэтуль незнаёмыя,
Вітаюць, як сябры.

Усюды мы жаданыя —
У полі і ў бары.
Прыроды мы адданыя,
Надзейныя сябры.

У сонейка, у месяца
Бываем у гасцях.
Зялёна, светла сцелецца
Наш у прыродзе шлях.

Усюды мы жаданыя —
У полі і ў бары.
Прыроды мы адданыя,
Надзейныя сябры.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Хто апавядае ў вершы: паэт ці юныя даследчыкі прыроды? Дакажыце.
2. Куды накіраваліся сябры прыроды? З якой мэтай яны падарожнічаюць? Як гэта іх характарызуе?
3. Чаму звяры ветліва сустракаюць гэтых вандроўнікаў? Паразважайце.
4. Як вы разумееце выраз «У сонейка, у месяца бываем у гасцях»?
5. Патлумачце сэнс радкоў:

   Зялёна, светла сцелецца
   Наш у прыродзе шлях.

6. Вывучыце верш на памяць.

**Давайце абмяркуем.** Ці лічыце вы сябе сябрамі прыроды? Чаму так думаеце?

## НАРОДНЫЯ ЗАГАДКІ ПРА ЖЫВЁЛ



- Маленькі шарык пад лаўкаю шна́рыць.
- Касматы, вусаты, есці пачынае — песенькі спявае.
- Ходзіць па двары, на нагах — кіпцюры, белае каменне нясе.
- Не кароль, а ў кароне; не гуса́р, а пры шпорах; гадзінніка не мае, а час знае.



Правообладатель Национальный институт образования



- З-за куста шыпу́ля, за нагу цапу́ля.
- Без станка, без рук, а кросны тчэ.



- Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб’е, той сваю кроў пралье.



- Чоран, ды не воран, рагаты, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць — вые, сядзе — зямлю рые.



## Творчае заданне

З дапамогай схемы складзіце загадку пра жывёлу.

ЗАГАДКІ

| з дапамогай **пытання** | з дапамогай **апісання** | з дапамогай **супраць-пастаўлення** |
|---|---|---|
| Хто на сабе хату носіць? *(Слімак.)* | Шапачка маленькая, камізэлечка нятканая, кафтанік рабенькі, ды ходзіць босенькі. *(Верабей.)* | Не рыба, а плыве; не конь, а ідзе; не піла, а рэжа. *(Бабёр.)* |



Правообладатель Национальный институт образования

## У свеце прыгожага

1. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Дональда Золана з серыі «Мілыя дзеці».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Як выглядае на партрэце дзяўчынка? Якога колеру ў яе валасы? Вочкі? У што яна апранута?

2) Каго трымае дзяўчынка? Як выглядае каცяня? Вусна апішыце яго.

3) Чаму аўтар паказаў дзяўчынку на фоне сонечнага святла?

4) Што хацеў увасобіць мастак у гэтай карціне?



Прачытайце прыказкі. Як вы разумееце іх сэнс?

### ПРЫКАЗКІ

- І над сабакам трэба літасць мець.
- Жывёлу гладзь не рукой, а мукой.



Правообладатель Национальный институт образования

**Маўленчая размінка.** Правільна вымаўляйце гукі [ў], [дз’], [г], [ц’] у пацешцы. Прачытайце яе павольна і ціха, хутка і радасна.



## ПАЦЕШКА

Ластаўка-каса́тка
Лепіць сабе хатку.
Не хатку — **гняздзечка.**
Знясе ў ім яе́чкі.
З я́ек за лета
Вы́ведзе дзетак.

*Ніна Галіноўская.*

***Гумно́*** — вялікая халодная будыніна для складвання і абмалоту збожжа.
***Аскаба́лак*** — кавалак, абломак чаго-небудзь.
***Тычы́на*** — вялікая палка; шост.
***Ласу́н*** — той, хто любіць пала́савацца (*рус.* пола́комиться).
***Дабрадзе́й*** — той, хто робіць дабро, аказвае дапамогу.
***Вал*** — тут: доўгі рад саломы, выкладзены на даху ў пэўным парадку.



Правообладатель Национальный институт образования